# САКРЭТ ШЧАСЦЯ І.В. САМАТОЙ

*Не так даўно ў старшага выкладчыка кафедры літаратуры філалагічнага факультэта Ірыны Вацлаваўны Саматой быў юбілейны дзень нараджэння. Яе віншавалі родныя, сябры, калегі. Сёння Ірына Вацлаваўна – госць рэдакцыі газеты «Мы і час». Выкладчыца ахвотна пагадзілася расказаць пра сябе:*

– У юбілейных датах так добра знаёмы кожнаму чалавеку прысмак радасці і смутку. Гэта вяртае ў пару дзяцінства, юнацтва – туды, адкуль выйшлі мы ўсе.

Нарадзілася і вырасла я ў адным з найпрыгажэйшых і сакральных куткоў Беларусі – мястэчку Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, дзе знаходзіцца нацыянальны санктуарый Маці Божай Будслаўскай.

Галоўныя прынцыпы выхавання ў нашай сям'і – рэлігійна-духоўныя і працоўныя. Вялікая ўвага надавалася адукацыі. Я скончыла Будслаўскую сярэднюю школу, дзе ўсе вучэбныя дысцыпліны выкладаліся па-беларуску. Гасцямі школы ў розныя часы былі такія вядомыя пісьменнікі, як У. Караткевіч, А. Лойка, М. Аўрамчык і інш. У вёсцы жыла беларуская артыстка, педагог, мемуарыстка Паўліна Мядзёлка. Усё гэта стварала атмасферу далучанасці да беларускай культуры, мовы, літаратуры. Натуральна, што пасля школы я паступіла на аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. І з гонарам магу сказаць, што маімі выкладчыкамі былі вядомыя айчынныя вучоныя, пісьменнікі: Л. Шакун, Д. Бугаёў, Н. Гілевіч, С. Александровіч, А. Лойка, В. Рагойша – сапраўдныя інтэлігенты з магутным інтэлектуальным патэнцыялам і высокімі маральнымі якасцямі. Пяць гадоў ва ўніверсітэце былі вельмі дынамічнымі: студэнцкія будатрады, удзел у агітбрыгадзе, навуковыя канферэнцыі, выязныя фальклорная і дыялекталагічная практыкі, абавязкова «восеньская бульба», частыя падарожжы з сябрамі, асабліва па Прыбалтыцы. Факультэцкім літаратурным аб'яднаннем «Узлёт» кіраваў доктар філалагічных навук, прафесар, пісьменнік Алег Лойка – чалавек, які даў пуцёўку ў літаратуру многім таленавітым студэнтам. Я таксама сябравала з літаратурнай творчасцю, друкавалася ў калектыўных паэтычных зборніках і перыядычных выданнях. Але паэзія галоўнай справай майго жыцця не стала.

Пасля заканчэння ўніверсітэта я настаўнічала на Полаччыне. Потым выкладала беларускую мову і літаратуру ў віцебскай сярэдняй школе № 3. Праз нейкі час мяне запрасілі працаваць на кафедру беларускай літаратуры (зараз – кафедра літаратуры) ВДУ імя П.М. Машэрава. І вось ужо 23 гады я выкладаю літаратуразнаўчыя дысцыпліны. Загадваю таксама народным літаратурным музеем.

У свой час мне пашчасціла працаваць з такімі таленавітымі выкладчыкамі, вучонымі, як А. Канапелька, З. Андрыянава, А. Емяльянаў, Л. Злобін і інш. Менавіта яны сталі для мяне прыкладам адданасці сваёй прафесіі, жыццёвай мудрасці і чалавечнасці.



Мая навуковая дзейнасць звязана з даследаваннем беларускамоўнай літаратуры Польшчы сярэдзіны XX – пачатку XXI стагоддзя, а таксама сучаснай беларускай літаратуры. Асаблівае задавальненне мне прыносіць праца са студэнтамі, якія, дарэчы, ахвотна займаюцца краязнаўчымі пошукамі, удзельнічаюць у рабоце літаратурнага музея. І мне вельмі прыемна назіраць, з якой цікавасцю і павагай яны адносяцца да той багатай спадчыны, пакінутай нам славутымі папярэднікамі, класікамі і сучаснікамі беларускай літаратуры. Дарэчы, любоў да роднага слова перадалася і маёй дачцэ Алесі, выпускніцы факультэта беларускай філалогіі і культуры нашага ўніверсітэта. Зараз яна працуе журналістам у гарадской газеце «Віцьбічы».

Пра сябе магу сказаць, што ўсё жыццё я раблю тое, што люблю, і люблю тое, што раблю. У гэтым, напэўна, і заключаецца сакрэт чалавечага шчасця.

**Падрыхтавала**
**Вера ЛАБЗОВА,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**